ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
2 чэрвеня
1994 года
№ 4(1709)

## СПЕЦЫЯЛЬНЫ ВЫПУСК ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ

## ПРАВІЛЫ ПРЫЁМУ Ў БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ НА 1994 ГОД

1. Для атрымання бясплатнай вышэйшай адукацыі ў Белдзяржуніверсітэт прымаюцца на конкурснай аснове асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю і пастаянна жывуць у Рэспубліцы Беларусь, а таксама грамадзяне Беларусі і беларусы, якія пражываюць за яе межамі.

2. Паступаючыя ў БДУ падаюць у прыёмную камісію наступныя дакументы: заяву на імя рэктара па адзінай форме, дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале, 6 фотакартак памерам 3×4, медыцынскую даведку па форме 086У, а на завочнае навучанне акрамя таго — выпіску (копію) з працоўнай кніжкі. Пашпарт прад'яўляецца асабіста.

3. Дакументы прымаюцца з 27 чэрвеня па 15 ліпеня. Уступныя экзамены праводзяцца з 16 ліпеня. Залічэнне ў склад студэнтаў — да 5 жніўня.

4. Пералік уступных экзаменаў па кожнай спецыяльнасці даецца ў дадатку 1.

5. Уступныя экзамены праводзяцца па праграмах, якія зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

6. Абітурыенты, якія не атэставаны па беларускай мове, могуць здаваць замест экзамена па беларускай мове і літаратуры экзамен па рускай мове і літаратуры. Гэта правіла не распаўсюджваецца на спецыяльнасці: беларуская мова і літаратура, беларуская і руская мова і літаратура, славянская мова і літаратура, класічныя мовы і літаратуры, журналістыка, гісторыя (беларускамоўнае аддз.). Пры паступленні на спецыяльнасць руская мова і літаратура абітурыенты, якія не атэставаны па беларускай мове, могуць здаваць замест экзамена па беларускай мове і літаратуры экзамен па замежнай мове.

7. Уступныя экзамены па замежнай мове (англійскай, французскай, нямецкай, іспанскай) абітурыенты могуць здаваць незалежна ад таго, па якой замежнай мове яны былі атэставаны.

8. Абітурыенты, якія не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да далейшых экзаменаў не дапускаюцца.

9. Залічэнне ва універсітэт праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на ўступных экзаменах.

10. На спецыяльнасць літаратурная работа прымаюцца асобы, якія навучаюцца ў БДУ і праявілі здольнасці да літаратурнай дзейнасці.

11. Асобы, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу, могуць быць залічаны на конкурснай аснове на платнае навучанне.

12. На спецыяльнасці эканоміка і кіраванне вытворчасцю і міжнародныя эканамічныя адносіны прыём ажыццяўляецца толькі на платнае навучанне.

13. Пераможцы (1, 2, 3 месца) рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд выпускнікоў школ і педвучылішчаў, праведзеных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1993—1994 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, залічваюцца без уступных экзаменаў пры ўмове паступлення на адпаведныя спецыяльнасці. Пры паступленні на іншыя спецыяльнасці такія асобы вызваляюцца ад уступнага экзамена па гэтай дысцыпліне з выстаўленнем адзнакі «пяць».

Пераможцы (1, 2, 3 месца) абласных і Мінскага гарадскога тураў алімпіяд выпускнікоў школ, праведзеных органамі кіравання Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1993—94 навучальным годзе па агульнаадукацыйных прадметах, вызваляюцца ад уступнага экзамена па гэтай дысцыпліне з выстаўленнем адзнакі «пяць» пры ўмове паступлення на адпаведныя спецыяльнасці.

Пералік агульнаадукацыйных прадметаў і адпаведных ім спецыяльнасцей даецца ў дадатку 2.

14. Асобы, якія скончылі сярэднюю школу з залатым (сярэбраным) медалём, сярэднюю спецыяльную ўстанову або ПТВ (на аснове базавай школы з атрыманнем сярэдняй адукацыі) з дыпломам з адзнакай, пры паступленні на **спецыяльнасці:** матэматыка, механіка, хімія, экалогія (хімічны фак-т), фізіка, прыкладная матэматыка, інфарматыка, эканамічная кібернетыка, радыёфізіка, фізічная электроніка залічваюцца без уступных экзаменаў па выніках субяседвання. Дакументы ад іх прымаюцца да 12 ліпеня ўключна, субяседванне — 13 ліпеня. Не прайшоўшыя субяседванне здаюць адзін экзамен, які прыведзены ў пераліку першым. Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены; пры паступленні на **спецыяльнасці:** геаграфія, экалогія (геаграфічны фак-т), геалогія, біялогія, экалогія (біялагічны фак-т), гісторыя, музейная справа, гісторыка-архівазнаўства, беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, славянская мова і літаратура, беларуская і руская мова і літаратура, класічныя мовы і літаратуры, сацыялогія, філасофія, эканамічная тэорыя, культуралогія, эканоміка і кіраванне вытворчасцю, міжнародныя эканамічныя адносіны здаюць адзін экзамен, які прыведзены ў пераліку першым. Пры атрыманні адзнакі «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены;

Пры паступленні на **спецыяльнасці:** міжнародныя адносіны, псіхалогія, журналістыка здаюць два экзамены, якія прыведзены ў пераліку першымі. Пры атрыманні адзнакаў «пяць» яны вызваляюцца ад астатніх экзаменаў, пры атрыманні іншых станоўчых адзнак — здаюць астатнія экзамены; пры паступленні на **спецыяльнасці:** правазнаўства, міжнароднае права, паліталогія здаюць усе экзамены.

15. Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца: воіны-інтэрнацыяналісты; дзеці інвалідаў вайны і загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў; круглыя сіроты і дзеці, што засталіся без апекі бацькоў; інваліды 1 і 2 груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў БДУ і якія могуць наведваць заняткі; асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

16. Пры іншых роўных умовах пераважнае права на залічэнне маюць інваліды 3 групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў і асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт. 19, 20, 23, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльнай абароне грамадзян, пацярпеўшых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС».

17. Пры паступленні на завочную форму навучання асобы, якія скончылі сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы па роднасных спецыяльнасцях з дыпломам з адзнакай і працуюць па атрыманай спецыяльнасці не менш за 6 месяцаў, залічваюцца без уступных экзаменаў па выніках субяседвання пры ўмове паступлення на адпаведныя спецыяльнасці. Для выпускнікоў ССНУ 1994 года працоўны стаж не патрабуецца. Дакументы ад такіх асоб прымаюцца да 12 ліпеня ўключна, субяседванне — 13 ліпеня. Не прайшоўшыя субяседванне паступаюць на падставах, прадугледжаных дадзенымі Правіламі.

18. На завочнае навучанне ў першую чаргу залічваюцца: выпускнікі сярэдніх і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, якія паступаюць па роднасных спецыяльнасцях; інваліды, якім не супрацьпаказана навучанне ў БДУ; ваеннаслужачыя, звольненыя ў запас на працягу трох апошніх гадоў; асобы, якія працуюць па профілю абранай спецыяльнасці не менш за 6 месяцаў.

На застаўшыяся планавыя месцы могуць залічвацца па конкурсу іншыя абітурыенты.

19. Атрыманне другой вышэйшай адукацыі ажыццяўляецца, як правіла, на ўмовах аплаты за навучанне.

20. Усе пытанні, звязаныя з прыёмам у БДУ, якія не адлюстраваны ў дадзеных Правілах, канчаткова вырашаюцца прыёмнай камісіяй.

## Дадатак I

### ПЕРАЛІК УСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ У БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ

Абітурыенты здаюць уступныя экзамены па дысцыплінах:

**МЕХАНІКА-МАТЭМАТЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.** МАТЭМАТЫКА, МЕХАНІКА. Конкурсныя экзамены: матэматыка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна).

**ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ.**
ПРЫКЛАДНАЯ МАТЭМАТЫКА, ІНФАРМАТЫКА, ЭКАНАМІЧНАЯ КІБЕРНЕТЫКА. Конкурсныя экзамены: матэматыка (пісьмова), матэматыка (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна).

**РАДЫЁФІЗІКІ І ЭЛЕКТРОНІКІ.**
РАДЫЕФІЗІКА, ФІЗІЧНАЯ ЭЛЕКТРОНІКА. Конкурсныя экзамены: фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна).

**ФІЗІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.**
ФІЗІКА. Фізіка (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна).

**БІЯЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.**
БІЯЛОГІЯ, ЭКАЛОГІЯ. Конкурсныя экзамены: біялогія (вусна), хімія (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне).

**ХІМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.**
ХІМІЯ, ЭКАЛОГІЯ. Конкурсныя экзамены: хімія (пісьмова), матэматыка (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна).

**ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.**
ГЕАГРАФІЯ, ЭКАЛОГІЯ, ГЕАЛОГІЯ. Конкурсныя экзамены: геаграфія (вусна), матэматыка (пісьмова), беларуская мова і літаратура (вусна).

**ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.**
ГІСТОРЫЯ (беларускамоўнае аддзяленне), МУЗЕЙНАЯ СПРАВА, ГІСТОРЫКА-АРХІВАЗНАЎСТВА. Конкурсныя экзамены: гісторыя Беларусі (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне), замежная мова (вусна).

ГІСТОРЫЯ (рускамоўнае аддзяленне). Конкурсныя экзамены: гісторыя Беларусі (вусна), беларуская мова і літаратура (вусна), руская мова і літаратура (сачыненне).

МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ. Конкурсныя экзамены: гісторыя Беларусі (вусна), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне), сусветная гісторыя навейшага часу (вусна).

**ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.**
ПАЛІТАЛОГІЯ, ПРАВАЗНАЎСТВА, МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА. Конкурсныя экзамены: матэматыка (пісьмова), беларуская мова і літаратура (сачыненне), замежная мова (вусна).

**ФІЛАСОФСКА-ЭКАНАМІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.**
САЦЫЯЛОГІЯ, ПСІХАЛОГІЯ, ФІЛАСОФІЯ, ЭКАНАМІЧНАЯ ТЭОРЫЯ, ЭКАНОМІКА І КІРАВАННЕ ВЫТВОРЧАСЦЮ, МІЖНАРОДНЫЯ ЭКАНАМІЧНЫЯ АДНОСІНЫ. Конкурсныя экзамены: матэматыка (пісьмова), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне).

КУЛЬТУРАЛОГІЯ. Конкурсныя экзамены: гісторыя Беларусі (вусна), замежная мова (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне).

**ЖУРНАЛІСТЫКІ.**
ЖУРНАЛІСТЫКА. Конкурсныя экзамены: творчы конкурс, беларуская мова і літаратура (творчае сачыненне), замежная мова (вусна).

**ФІЛАЛАГІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ.**
БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА, БЕЛАРУСКАЯ І РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА. Конкурсныя экзамены: беларуская мова і літаратура (вусна), беларуская мова і літаратура (сачыненне), руская мова і літаратура (вусна).

РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА. Конкурсныя экзамены: руская мова і літаратура (вусна), руская мова і літаратура (сачыненне), беларуская мова і літаратура (вусна).

СЛАВЯНСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА, КЛАСІЧНЫЯ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ. Конкурсныя экзамены: беларуская мова і літаратура (вусна), руская мова і літаратура (сачыненне), замежная мова (вусна).

## Дадатак II

### ПЕРАЛІК АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ І АДПАВЕДНЫХ ІМ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ У БДУ

**Прадмет МАТЭМАТЫКА— СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:** матэматыка, механіка, прыкладная матэматыка, інфарматыка, эканамічная кібернетыка;

**Прадмет ІНФАРМАТЫКА — СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ:** інфарматыка;

**Прадмет ХІМІЯ — СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:** хімія, экалогія (хімічны факультэт);

**Прадмет БІЯЛОГІЯ — СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:** біялогія, экалогія (біялагічны факультэт);

**Прадмет ГЕАГРАФІЯ — СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:** геаграфія, экалогія (геаграфічны факультэт);

**Прадмет ФІЗІКА — СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:** фізіка, радыёфізіка, фізічная электроніка;

**Прадмет БЕЛАРУСКАЯ МОВА — СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:** беларуская мова і літаратура, беларуская і руская мова і літаратура, славянская мова і літаратура, класічныя мовы і літаратуры;

**Прадмет РУСКАЯ МОВА — СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ:** руская мова і літаратура, беларуская і руская мова і літаратура.

***Прыёмная камісія размяшчаецца ў Геаграфічным корпусе (пакоі 101, 112, 114).***
***Дакументы можна здаць асабіста ці выслаць поштай на адрас: 220050, г. Мінск, пр-т Скарыны, 4, БДУ, прыёмная камісія.***

# ПЛАН ПРЫЁМУ СТУДЭНТАЎ НА ПЕРШЫ КУРС БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА

| Спецыяльнасць | Разам | У тым ліку | |
|---|---|---|---|
| | | на дзённае навучанне | на завочнае навучанне |
| МАТЭМАТЫКА | 155 | 130 | 25 |
| МЕХАНІКА | 25 | 25 | — |
| ФІЗІКА | 140 | 140 | — |
| РАДЫЁФІЗІКА | 65 | 65 | — |
| ФІЗІЧНАЯ ЭЛЕКТРОНІКА | 50 | 50 | — |
| ХІМІЯ | 85 | 85 | — |
| ЭКАЛОГІЯ (ХІМ.) | 10 | 10 | — |
| БІЯЛОГІЯ | 140 | 90 | 50 |
| ЭКАЛОГІЯ (БІЯЛ.) | 10 | 10 | — |
| ГЕАГРАФІЯ | 130 | 80 | 50 |
| ЭКАЛОГІЯ (ГЕАГ.) | 10 | 10 | — |
| ГЕАЛОГІЯ | 15 | 15 | — |
| ПРЫКЛАДНАЯ МАТЭМАТЫКА | 70 | 70 | — |
| ІНФАРМАТЫКА | 60 | 60 | — |
| ЭКАНАМІЧНАЯ КІБЕРНЕТЫКА | 20 | 20 | — |
| МУЗЕЙНАЯ СПРАВА | 35 | 15 | 20 |
| ГІСТОРЫЯ (БЕЛАР. АДДЗ.) | 100 | 50 | 50 |
| ГІСТОРЫЯ (РУСК. АДДЗ.) | 25 | 25 | — |
| ГІСТОРЫКА-АРХІВАЗНАЎСТВА | 35 | 15 | 20 |
| МІЖНАРОДНЫЯ АДНОСІНЫ | 25 | 25 | — |
| БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА | 190 | 140 | 50 |
| БЕЛАРУСКАЯ І РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА | 60 | 60 | — |
| РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА | 75 | 50 | 25 |
| СЛАВЯНСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА | 10 | 10 | — |
| КЛАСІЧНЫЯ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ | 20 | 20 | — |
| ЖУРНАЛІСТЫКА | 75 | 50 | 25 |
| ФІЛАСОФІЯ | 15 | 15 | — |
| ПСІХАЛОГІЯ | 15 | 15 | — |
| САЦЫЯЛОГІЯ | 40 | 20 | 20 |
| ЭКАНАМІЧНАЯ ТЭОРЫЯ | 35 | 15 | 20 |
| КУЛЬТУРАЛОГІЯ | 15 | 15 | — |
| ЭКАНОМІКА І КІРАВАННЕ ВЫТВОРЧАСЦЮ | 15'' | 15'' | — |
| МІЖНАРОДНЫЯ ЭКАНАМІЧНЫЯ АДНОСІНЫ | 15'' | 15'' | — |
| ПАЛІТАЛОГІЯ | 15 | 15 | — |
| ПРАВАЗНАЎСТВА | 250 | 150 | 100 |
| МІЖНАРОДНАЕ ПРАВА | 25 | 25 | — |
| УСЯГО | 2045+30'' | 1590+30'' | 455 |

'' — прыём ажыццяўляецца толькі на платнае навучанне

# ЮРЫДЫЧНЫ

***ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ — асноўны цэнтр Рэспублікі Беларусь па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў па правазнаўству. На яго дзённым і завочным аддзяленнях вучыцца больш за 2,5 тысячы студэнтаў.***

З 1992 года факультэт перайшоў на двухузроўневую падрыхтоўку спецыялістаў, прынятую ў сусветнай практыцы. Асобам, якія паспяхова закончылі першы ўзровень (чатыры з паловай гады навучання), будзе прысвоена ступень бакалаўра. Яны атрымаюць магчымасць працягваць яшчэ паўтара гады паглыбленае навучанне па абранай спецыяльнасці ў магістратуры з прысвойваннем ступені магістра права.

На завочным аддзяленні тэрмін навучання складае шэсць гадоў. Асобы, якія раней закончылі вышэйшую навучальную ўстанову, могуць атрымаць на факультэце вышэйшую юрыдычную адукацыю за плату (за свой кошт ці за кошт прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў). Тэрмін навучання ў гэтым выпадку — 4 гады.

За час вучобы на факультэце студэнты вывучаюць тэорыю дзяржавы і права, дзяржаўнае, адміністрацыйнае, грамадзянскае, крымінальнае, міжнароднае права, крымінальны і грамадзянскі працэс, крыміналістыку і іншыя дысцыпліны.

**Юрыдычны факультэт рыхтуе спецыялістаў па правазнаўству па шасці спецыяльнасцях: дзяржаўна-прававой, гаспадарча-прававой, судова-пракурорскай, следча-крыміналістычнай і судова-экспертнай, міжнароднаму праву і прававому забеспячэнню знешнеэканамічнай дзейнасці, падаткаваму і банкаўскаму праву.**

Дзяржаўна-прававая спецыялізацыя дае студэнтам глыбокую падрыхтоўку для работы ў Саветах народных дэпутатаў, іх выканкамах, апаратах міністэрстваў, ведамстваў і іншых органаў дзяржаўнай улады і кіравання.

Выпускнікі гаспадарча-прававой спецыяльнасці накіроўваюцца ў міністэрствы, ведамствы, на прадпрыемствы, ва ўстановы і арганізацыі для работы юрысконсультамі.

Па судова-пракурорскай спецыяльнасці вядзецца падрыхтоўка суддзяў, пракурораў, адвакатаў, дзяржаўных натарыусаў і іншых работнікаў юстыцыі.

На следча-крыміналістычнай і судова-экспертнай спецыялізацыі, рыхтуюцца следчыя, эксперты-крыміналісты і судовыя эксперты.

Спецыялізацыя «Міжнароднае права і прававое забеспячэнне знешнеэканамічнай дзейнасці» дасць магчымасць яе выпускнікам працаваць у апараце Міністэрства замежных спраў, дыпламатычных місіях рэспублікі за мяжой, сумесных прадпрыемствах, іншых арганізацыях і ўстановах.

Пасля спецыялізацыі па падаткаваму і банкаўскаму праву выпускнікі факультэта могуць выкарыстаць свае веды ў органах падаткавай службы і ўстановах банкаў.

У 1993 годзе на факультэце адкрылася самастойнае аддзяленне міжнароднага права. На гэтым аддзяленні прадугледжана вывучэнне асноўных галін права Рэспублікі Беларусь і замежнага права. Яго выпускнікі будуць паглыблена вывучаць замежную мову.

Вучэбны працэс забяспечваюць 9 кафедраў: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, экалагічнага і аграрнага права, міжнароднага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, крыміналістыкі. На ўсіх кафедрах працуюць высокакваліфікаваныя выкладчыкі, сярод якіх 13 дактароў і 57 кандыдатаў навук.

На факультэце ёсць бібліятэка, лабараторыя заканадаўства, а таксама крыміналістычная лабараторыя.

Студэнты факультэта актыўна ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце. Яны пішуць курсавыя работы, выступаюць з дакладамі на навуковых студэнцкіх канферэнцыях, удзельнічаюць у рэспубліканскіх алімпіядах і аглядах-конкурсах студэнцкіх навуковых работ.

У час вучобы на факультэце студэнты праходзяць вучэбную і вытворчую практыку ў выканкамах Саветаў народных дэпутатаў, судах, пракуратурах, следчых органах, юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і ўстаноў. Заканчваецца навучанне абаронай дыпломнай работы і здачай дзяржаўных экзаменаў.

Студэнты факультэта, якія добра праявілі сябе ў навукова-даследчай рабоце, рэкамендуюцца для паступлення ў аспірантуру. Прафесарска-выкладчыцкі састаў юрыдычнага факультэта камплектуецца ў асноўным выпускнікамі факультэта, якія абаранілі кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

Юрыдычны факультэт мае добрыя ўмовы для раскрыцця здольнасці і талентаў студэнтаў. На базе музея гісторыі факультэта працуе гісторыка-культурны цэнтр.

**В. ГАДУНОЎ,**
**дэкан юрыдычнага факультэта.**

# ХІМІЧНЫ

**ХІМІЧНЫ факультэт заснаваны ў 1931 годзе і сёння з'яўляецца адзіным цэнтрам у рэспубліцы па падрыхтоўцы хімікаў з вышэйшай універсітэцкай адукацыяй. За гэтыя гады падрыхтавана каля 5 тысяч высокакваліфікаваных спецыялістаў-хімікаў, якія ўнеслі і ўносяць значны ўклад у развіццё хімічных навук і хімічнай прамысловасці ў рэспубліцы, паспяхова працуюць у агульнаадукацыйных школах, тэхнікумах, вышэйшых навучальных установах.**

На хімічным факультэце будзе ажыццяўляцца прыём 95 чалавек: на агульны паток 85 чалавек і 10 на спецыяльнасць «хімік-эколаг» па асобнаму конкурсу. Астатнія студэнты змогуць атрымаць кваліфікацыю або «хімік» (вытворчае аддзяленне), альбо «хімік» — выкладчык хіміі (педагагічнае аддзяленне), у залежнасці ад іх выбару пасля 1 курса.

На факультэце дзейнічаюць шэсць кафедр: неарганічнай, аналітычнай, арганічнай хіміі, высокамалекулярных злучэнняў, фізічнай хіміі, радыяцыйнай хіміі і хімічнай тэхналогіі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі. На факультэце працуюць 12 дактароў і каля 100 кандыдатаў навук. Пры кафедрах факультэта дзейнічае шэраг навукова-даследчых лабараторый, супрацоўнікі якіх (таксама як і супрацоўнікі навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем, што працуе ў цесным кантакце з хімічным факультэтам) прыцягваюцца да вядзення вучэбнага працэсу.

За пяцігадовы перыяд навучання на дзённым аддзяленні студэнты атрымліваюць шырокую агульнапрафесійную падрыхтоўку, якая забяспечваецца вывучэннем у шырокім аб'ёме такіх дысцыплін хімічнага цыкла, як аналітычная, арганічная, неарганічная, калоідная, квантавая, фізічная хімія, хімія высокамалекулярных злучэнняў, крышталяхімія, будова рэчыва, хімічная тэхналогія і мадэліраванне тэхналагічных працэсаў і іншыя. Універсітэцкая адукацыя забяспечвае і дастаткова глыбокую агульнагуманітарную падрыхтоўку спецыялістаў-хімікаў, якая ажыццяўляецца дзякуючы вывучэнню дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыкла.

Падрыхтоўка па спецыялізацыі пачынаецца з чацвёртага курса. У гэты перыяд навучання ўсе студэнты выконваюць навуковыя даследванні, якія перарастаюць у дыпломныя работы. Значная частка дыпломных работ выконваецца ў навукова-даследчым інстытуце фізіка-хімічных праблем Белдзяржуніверсітэта, у Інстытутах АН РБ.

Студэнты, якія рыхтуюцца да педагагічнай дзейнасці, вывучаюць шэраг дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла і праходзяць педагагічную практыку. Студэнты вытворчага аддзялення праходзяць паглыбленую спецыяльную падрыхтоўку па кафедрах, вывучаюць цыкл спецыяльных дысцыплін, які забяспечвае атрыманне сучасных тэарэтычных ведаў у пэўнай галіне хіміі. Студэнты вытворчага аддзялення праходзяць экскурсійную вытворчую практыку на базе прадпрыемстваў і НДІ рэспублікі. Лепшыя студэнты атрымліваюць рэкамендацыі для паступлення ў аспірантуру. Выпускнікі вытворчага аддзялення накіроўваюцца на працу ў навукова-даследчыя ўстановы або на прадпрыемствы электроннай, радыётэхнічнай і хімічнай прамысловасці.

Факультэт падтрымлівае цесныя сувязі з многімі навукова-даследчымі ўстановамі, як у Рэспубліцы Беларусь, так і за яе межамі. Факультэт ажыццяўляе мэтавую падрыхтоўку спецыялістаў для ВА «Інтэграл», АН РБ, Міністэрства народнай адукацыі.

**А. ШАДЫРА,**
**дэкан хімічнага факультэта.**

# ГЕАГРАФІЧНЫ

ГЕАГРАФІЧНЫ факультэт — вядучы цэнтр падрыхтоўкі студэнтаў па фізічнай, эканамічнай геаграфіі, геамарфалогіі, краязнаўству і методыцы арганізацыі экскурсійнай справы, рацыянальнаму прыродакарыстанню і ахове прыроды. З 1994 года на факультэце пачнецца падрыхтоўка спецыялістаў па новых спецыяльнасцях — «Экалогія» і «Геалогія». У саставе факультэта сем кафедраў і сем навукова-даследчых лабараторый: агульнага землязнаўства, лімналагічнага маніторынга, праблемная лабараторыя экалогіі ландшафтаў, палеагеафічных метадаў пошуку карысных выкапняў, лабараторыя геафізічных праблем рацыянальнага выкарыстання мінеральных рэсурсаў, эканоміка-геаграфічных праблем рацыянальнага прыродакарыстання і навукова-даследчая лабараторыя комплекснага картаграфіравання і геаэкалагічнага прагназіравання, а таксама музей агульнага землязнаўства, вучэбна-геаграфічная станцыя «Заходняя Бярэзіна».

Студэнты факультэта атрымліваюць вялікую і разнастайную прыродазнаўча-навуковую і спецыяльную падрыхтоўку.

Значнае месца ў падрыхтоўцы спецыялістаў географаў належыць вучэбна-вытворчай практыцы. Студэнты I і 2 курсаў на геаграфічнай станцыі «Заходняя Бярэзіна» праходзяць вучэбную практыку па тапаграфіі, геалогіі, гідралогіі, геамарфалогіі, глебазнаўству, метэаралогіі, біягеаграфіі, ландшафтазнаўству і эканамічнай геаграфіі. Комплексная геаграфічная практыка студэнтаў другога курса праводзіцца за межамі рэспублікі. Старшакурснікі праходзяць вытворчую практыку ў навукова-даследчых інстытутах Акадэміі навук Беларусі, навукова-даследчых лабараторыях геаграфічнага факультэта, праектных, планавых і гаспадарчых арганізацыях, уключаюцца ў склад экспедыцый, якія праводзяць работу ў Беларусі і за яе межамі. Студэнты факультэта прымаюць актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце. Пры ўсіх кафедрах працуюць навукова-даследчыя гурткі.

Факультэт рыхтуе кадры географаў па спецыялізацыях: геамарфалогія, рацыянальнае прыродакарыстанне і ахова прыроды, методыка арганізацыі турысцка-экскурсійнай справы; фізічная геаграфія; сацыяльна-эканамічная геаграфія; геаграфія глебаў, зямельныя рэсурсы, меліярацыя; картаграфія; гідралогія сушы; рэгіянальнае планаванне і кіраванне гаспадаркай; метэаралогія і кліматалогія; демаграфія. Выпускнікі факультэта працуюць у агульнаадукацыйных школах, сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, інстытутах Акадэміі навук Беларусі, праектных і планавых арганізацыях, на картаграфічных прадпрыемствах, у гідраметэаслужбе, бюро падарожжаў і экскурсій і на турбазах. Лепшыя студэнты атрымліваюць рэкамендацыю для паступлення ў аспірантуру.

**Р. ЖМОЙДЗЯК,**
**дэкан геаграфічнага факультэта.**

# БІЯЛАГІЧНЫ

**ФАКУЛЬТЭТ рыхтуе біёлагаў па спецыяльнасці «Біялогія». Падрыхтоўка вядзецца на дзённай і завочнай формах навучання. Выпускнікам прысвойваецца кваліфікацыя «Біёлаг. Выкладчык біялогіі і хіміі».**

Агульнаадукацыйная падрыхтоўка на факультэце ажыццяўляецца шляхам вывучэння цыкла грамадскіх і агульнаадукацыйных дысцыплін і дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыкла (псіхалогія, педагогіка, методыка выкладання біялогіі, хіміі і інш.)

Агульнапрафесійная падрыхтоўка пачынаецца з першага курса і забяспечваецца вывучэннем батанікі, заалогіі, анатоміі чалавека, цыталогіі і гісталогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, мікрабіялогіі, вірусалогіі, біяхіміі, біяфізікі, генетыкі з асновамі селекцыі, асноў імуналогіі, тэорыі эвалюцыі, экалогіі і рацыянальнага прыродакарыстання, біятэхналогіі і г.д.

Спецыялізацыя ажыццяўляецца па батаніцы, заалогіі, фізіялогіі раслін, фізіялогіі чалавека і жывёл, біяхіміі, генетыцы, мікрабіялогіі, экалогіі і біятэхналогіі, пачынаючы з 3 курса на стацыянары і з 4 — на завочным аддзяленні. У рамках спецыялізацыі студэнты вывучаюць 10 спецдысцыплін, а таксама вялікі спецпрактыкум. На ўсіх курсах прадугледжаны практыкі: на I і II — па батаніцы і заалогіі ў натуральных біяцэнозах Беларусі, на 3 — вучэбная практыка па спецыялізацыі на кафедрах, у біяцэнозах, НДІ, на 4 і 5 курсах — вытворчая і педагагічная практыка.

Вучэбны працэс і навуковую работу факультэта забяспечваюць восем кафедраў, праблемная навукова-даследчая лабараторыя, навуковыя лабараторыі кафедраў, заамузей, батанічны сад, вучэбна-доследная гаспадарка «Шчамысліца».

Вучэбную і навуковую работу вядуць на факультэце не толькі супрацоўнікі універсітэта, але і работнікі АН РБ біялагічнага профілю.

Пасля заканчэння факультэта выпускнікі накіроўваюцца на работу настаўнікамі сярэдніх школ і вучэбных устаноў, выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў, супрацоўнікамі Дзяржкамітэта па ахове прыроды, запаведнікаў, а таксама на прыдпрыемствы і ва ўстановы сельскай і лясной гаспадаркі.

Выпускнікі, якія паказалі схільнасць да навукова-даследчай работы, высокую эрудыцыю па біялогіі, атрымліваюць рэкамендацыю савета факультэта для паступлення ў аспірантуру, а таксама размяркоўваюцца ў інстытуты медыцынскага, сельскагаспадарчага — агульнабіялагічнага профілю на навуковую работу.

**А. ШУКАНАЎ,**
**дэкан біялагічнага факультэта.**

# ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ

ФАКУЛЬТЭТ ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ быў створаны ў 1970 годзе з мэтай прафесійнай падрыхтоўкі на Беларусі матэматыкаў-прыкладнікоў, спецыялістаў у галіне выкарыстання матэматычных метадаў выкарыстання і даследвання самых розных задач, якія ўзнікаюць у навуцы, тэхніцы і іншых галінах народнай гаспадаркі, з высокім выкарыстаннем сучасных хуткадзеючых электронных вылічальных машын. Гэта спецыялісты, якія валодаюць глыбокімі ведамі па агульнатэарэтычных і спецыяльных матэматычных дысцыплінах, знаёмыя з магчымасцямі ЭВМ і здольныя разам з прадстаўнікамі іншых спецыяльнасцей весці навукова-даследчую работу па складанню матэматычных мадэлей розных працэсаў, распрацоўцы алгарытмаў, іх лічбавага рашэння на ЭВМ, а таксама па стварэнню матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання і праектавання самых АСК і іх комплексаў.

На працягу першых двух гадоў студэнты факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі атрымліваюць глыбокую агульнанавуковую падрыхтоўку, якая ўключае асноўныя матэматычныя дысцыпліны, а таксама асновы эксплуатацыі ЭВМ.

**Спецыяльнасць прыкладная матэматыка ўключае наступныя спецыялізацыі: матэматычная фізіка, матэматычнае мадэліраванне, вылічальная дыягностыка, лічбавыя метады даследвання аперацый і сістэмны аналіз, аптымізацыя і аптымальнае кіраванне, тэорыя імавернасцей і матэматычная статыстыка, матэматычная кібернетыка, матэматычнае праграмнае забеспячэнне праблемна-арыентаваных сістэм, архітэктура вылічальных сістэм і сетак, матэматычнае забеспячэнне аўтаматызаваных сістэм праектавання і кіравання, матэматычнае і праграмнае забеспячэнне вылічальных машын і сістэм.**

З 1989 года факультэт пачаў таксама падрыхтоўку па спецыяльнасці «Праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм», якая з гэтага года мае назву «Інфарматыка». Гэтая спецыяльнасць уключае спецыялізацыі:**праграмнае забеспячэнне вылічальных сістэм, праграмнае забеспячэнне аўтаматызаваных вытворчасцей, праграмнае забеспячэнне сістэм аўтаматызацыі праектавання, сістэмы штучнага інтэлекту. Спецыяльнасць прадугледжвае большую накіраванасць на навуковыя і тэхнічныя праблемы, звязаныя са стварэннем і выкарыстаннем аўтаматызаваных і вылічальных сістэм.**

З 1991 года на факультэце пачалася падрыхтоўка па новай спецыяльнасці «Эканамічная кібернетыка» з кваліфікацыяй матэматык-эканаміст. Гэта спецыяльнасць уключае наступныя спецыялізацыі: **«Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне камп'ютэрнага аналізу, мадэліравання і прагназіравання ў эканоміцы», «Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне аптымальных сістэм планавання і кіравання ў эканоміцы», «Матэматычнае і праграмнае забеспячэнне сістэм апрацоўкі эканамічнай інфармацыі». Новая спецыяльнасць прадугледжвае падрыхтоўку прафесіяналаў, якія будуць валодаць фундаментальнай падрыхтоўкай у галіне матэматыкі, праграміравання і эканомікі.** Патрэба ў гэтых спецыяльнасцях дыктуецца неабходнасцю шырокага выкарыстання імітацыйнага мадэліравання, матэматычных метадаў, прагназіравання і прыняцця рашэнняў інтэнсіўнага выкарыстання тэхнікі і АРМ для забеспячэння эфектыўных эканамічных працэсаў.

Уся вучэбная і навукова-даследчая работа са студэнтамі вядзецца выкладчыкамі адзінаццаці кафедраў, супрацоўнікамі галіновых лабараторый і вылічальнага цэнтра, а таксама вядомымі спецыялістамі з прадпрыемстваў і ўстаноў, з якімі факультэт падтрымлівае навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва.

Вялікая ўвага надаецца самастойнай навукова-даследчай рабоце студэнтаў. На факультэце працуюць студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, у якіх студэнты, выкарыстоўваючы тэарэтычныя веды, распрацоўваюць пакеты прыкладных праграм для вырашэння розных задач народнай гаспадаркі і ўкараняюць перспектыўнае матэматычнае забеспячэнне АСК і ЭВМ.

**В. КАРЗЮК,**
**дэкан факультэта**
**прыкладной матэматыкі**

# ЖУРНАЛІСТЫКІ

***Пачынаючы з 1944 года, факультэт журналістыкі рыхтуе кадры прафесійных работнікаў для сродкаў масавай інфармацыі. За час існавання факультэта вышэйшую адукацыю на ім атрымалі звыш трох тысяч журналістаў. Выпускнікі журфака — гэта вядучыя работнікі ўсіх рэдакцый газет, радыё, тэлебачання, выдавецтваў, інфармацыйных агенцтваў Беларусі, вядомыя беларускія пісьменнікі, вучоныя.***

Сёння факультэт аб'ядноўвае 5 кафедраў: гісторыі журналістыкі і літаратуры, тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі, тэлебачання і радыёвяшчання, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, замежнай журналістыкі і літаратуры. Падрыхтоўка студэнтаў як на дзённай, так і на завочнай формах навучання вядзецца больш чым па 10 спецыялізацыях: **журналіст-палітолаг, журналіст-міжнароднік, публіцыст-аналітык, адказны сакратар, фотарэпарцёр, рэдактар рэкламы, рэпарцёр РТ, каментатар** і іншыя. Вядомыя вучоныя і журналісты, вопытныя выкладчыкі перадаюць будучым калегам багаты практычны вопыт, даюць глыбокія веды па грамадскіх і спецыяльных дысцыплінах, вядуць навукова-даследчую работу па гісторыі, тэорыі і практыцы журналістыкі.

Навуковыя даследванні вядуць і студэнты факультэта, якія актыўна ўдзельнічаюць у рабоце студэнцкага навуковага таварыства, займаюцца ў навуковых гуртках пры кафедрах.

Акрамя агульнаадукацыйных курсаў, вывучаецца і шэраг спецыяльных дысцыплін: тэорыя і практыка сучаснай журналістыкі, журналісцкае майстэрства, тэорыя і практыка тэлебачання і радыёвяшчання, гісторыя беларускай і замежнай журналістыкі, тэхніка сродкаў масавай інфармацыі, асновы фотарэпартажу, камп'ютэрнай тэхнікі, сацыялогія, практычная стылістыка і літаратурнае рэдагаванне.

Журфак — творчы факультэт, вучыцца на ім цікава. Студэнты набываюць веды не толькі на практычных і лабараторных занятках, але і ў час вытворчай практыкі, якую яны праходзяць штогод у рэдакцыях раённых, абласных, рэспубліканскіх газет, на тэлебачанні і радыёвяшчанні. Тыя, хто паспяхова вучыцца, на старэйшых курсах пачынаюць працаваць у гэтых рэдакцыях.

Наладжваюцца сувязі з факультэтамі журналістыкі універсітэтаў замежных краін. Лепшыя студэнты факультэта (з тых, хто добра ведае замежную мову) маюць магчымасць працягваць адукацыю ў краінах Заходняй Еўропы.

Той, хто паступае на факультэт журналістыкі, павінен асэнсаваць, што выбар прафесіі зроблены ім не выпадкова. Гэтаму садзейнічае правядзенне творчага конкурсу. Добрую падрыхтоўку да яго праводзіць спецыяльна створаная пры факультэце «Школа юнкора». Практыка паказала, што творчы конкурс дапамагае значна палепшыць адбор здольнай моладзі, якая мае схільнасць да творчай практыцы.

Калектыў факультэта журналістыкі рыхтуе прафесіяналаў, якія глыбока ведаюць законы грамадскага развіцця і здольныя аб'ектыўна адлюстроўваць рэчаіснасць у сродках масавай інфармацыі.

**А. СЛУКА,**
**дэкан факультэта**
**журналістыкі.**

# ФІЛАЛАГІЧНЫ



НАЗВА нашага факультэта двухкаранёвая, бо два словы грэчаскага паходжання спалучаны ў ёй: «філа» і «логас». І калі «логас», што па-беларуску значыць «слова», ёсць паняцце, братняе логіцы, рацыі, уласна навуцы, абстрактнаму мысленню, то першая палова — аснова эпітэта, што характарызуе наш факультэт, як бы зусім не навуковая, не універсітэцкая. У дакладным перакладзе «філа» значыць «люблю», інакш кажучы, проста называе пачуццё, а ні што іншае. Ды ці ж пачуцці могуць быць стасоўныя, спалучаныя з сапраўднай навукай, з фундаментальнасцю, з логасам? Тыя пачуцці, што няўлоўныя, як весні ветрык, трапяткія, як дыханне, вагомыя і знікомыя, як хвалі? Аказваецца, могуць. Аказваецца, любоў, яна не за парогам універсітэта. Але ўсё ж такі толькі цераз парог аднаго філалагічнага факультэта любоў, пачуццё адкрыта ўступае ва універсітэт, бо гэта толькі ў адзінага нашага факультэта ў назве пачуццё любві аднатавана, зацверджана. Вядома ж, любы спецыяліст — ці фізік, ці біёлаг, ці матэматык, ці хімік — як спецыяліст пачынаецца з любові да свайго прадмета, да сваіх дысцыплін-абранніцаў. Але фізік ці матэматык любіць ураўненні ці лагарыфмы, як і хімік — табліцу Мяндзялеева ці біёлаг — навуку аб раслінным і жывёльным свеце, спецыяльна не вяшчаючы пра тое. І філолаг тут першым чынам наперадзе, бо ён не можа забыцца, што менавіта з любові і толькі з любові прафесія пачынаецца, што выбару няма без любові, што абавязкова любоў павінна кіраваць выбарам.

Філолаг — аматар слова. Філолаг ганарыцца сваёй адкрытай любоўю да слова. Філолаг ганарыцца і тым, што ён — адзін з першых сярод гуманітарыяў ва універсітэце, сярод гісторыкаў, філосафаў, журналістаў, юрыстаў. І ягоная, філолага, любоў да слова ёсць адначасна і непасрэдны мост і прыналежнасць да ўсіх высокіх духоўных каштоўнасцей, якія словам акрэсліваюцца і ўваходзяць у агульначалавечую скарбніцу непераходнага значэння: праўда, справядлівасць, сумленнасць, дабрата, прыгоства, цнатлівасць. Любоў філолага менавіта магутная сваёй злітнасцю з гуманістычнымі ідэямі і традыцыямі. Іх сцвярджэнне сёння ў нашым грамадстве — адна з першасных задач. І таму так патрэбны сёння грамадству гуманітарыі, філолагі, любоў да слова. І таму філфак так чакае сёння сапраўды ўлюбёных у слова юнакоў і дзяўчат, падзвіжнікаў любові да слова.

Філфак сёння — абнаўляецца. Прыкмет таго шмат: адкрыццё новых кафедраў, набор студэнтаў на новыя спецыяльнасці і навучанне па новых вучэбных планах. Яшчэ нядаўна слова «бакалаўр» мы ўспаміналі, толькі калі вывучалі біяграфію Францішка Скарыны і называлі яго першую навуковую ступень, якую ён у 1506 годзе атрымаў у Кракаўскім універсітэце. Яшчэ зусім нядаўна слова «магістр» мы ўспаміналі, вывучаючы біяграфію Цёткі, якая так і не напісала магістарскай работы, будучы студэнткай таго ж самага Кракаўскага універсітэта. А сёння ўжо нашыя вучэбныя планы з'арыентаваныя на падрыхтоўку і ў наш час у нас і новых бакалаўраў, і новых магістраў.

І яшчэ сёння наш філфак арыентуецца і на тое, каб стаць такім цэнтрам навучальнай філасофіі, вокны якога былі б насцеж адчынены ў самы шырокі свет, бо не толькі ў славістыку, і ў класічную філалогію, і ў арабістыку, і ў габрайства і г. д.

Тэорыя і практыка нас роўна абавязвае: тэорыя і практыка і лінгвістыкі і літаратуразнаўства. Тэорыя вядзе ўглыб, практыка — ушыр. Стаць акадэмічнымі, стаць паліглотамі — гэта нам задача.

І яшчэ стаць увогуле красамоўнымі — толькі красамоўцы валодаюць і роднай мовай, і ўсімі іншымі, якія мы вывучаем зараз, і якія яшчэ будзем выкладаць. Пагэтаму сярод новых кафедраў на адно з першых месцаў павінна выйсці ў наш час і кафедра рыторыкі, як павінны таму спрыяць і спецыфічныя дысцыпліны і спецкурсы, якія будуць разгадваць законы творчай думкі, псіхалогіі і творчасці, паэтычнага майстэрства, прыгоства і лагічнага мыслення і спантаннага эмацыянальнага прамоўніцтва.

І яшчэ філфак кліча вас не толькі да слова і ўвогуле да літаратуры,— ён кліча вас перад усім з любоўю да роднай мовы і літаратуры — да беларускай мовы і беларускай літаратуры.

Гэта найвялікшая справа — звязаць сваю маладосць, свае здольнасці і таленты са словам Францішка Скарыны, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча. Толькі філфак узвысіць вас да разумення нацыянальных духоўных вяршынь, толькі філфак заглыбіць вас у бяздонныя глыбіні як народнага слова, так і мастацкі гранёнага слова ў неўміручых струменях фальклора і ў неўтаймоўнай Леце, у якой рукапісы не гараць, у якой тое не кане, што ёсць праўдай і красой.

Філфак кліча тых, хто любіць слова і паэзію, філфак і навучыць любіць слова і паэзію. Прагнеце вы гэтага — філфак вас чакае. Але зноў жа і зноў запыніцеся на гэтым пытанні: «Люблю?.. Не люблю?» Не як на рамонкавай кветцы гадайце, не на выпадковасць зважайце,— зважайце на ўсхваляваны пульс і сэрцабіццё вашыя.

Любоў да слова і літаратуры хай жа выбірае толькі той, хто іх любіць ужо, хто не любіць іх не можа, не палюбіць — не можа!..

**А. ЛОЙКА,**
**дэкан філалагічнага**
**факультэта.**

# ГІСТАРЫЧНЫ

***Гістарычны факультэт БДУ з'яўляецца буйнейшым цэнтрам падрыхтоўкі спецыялістаў-гісторыкаў. Год яго афіцыйнага адкрыцця – 1934. За час свайго існавання факультэт падрыхтаваў каля 8 тысяч спецыялістаў. Зараз на дзённай і завочнай форме навучання займаецца звыш тысячы двухсот студэнтаў.***

З 1990 года адкрыта беларускамоўнае аддзяленне па падрыхтоўцы гісторыкаў. Праграма навучання на гэтым аддзяленні адрозніваецца больш глыбокай увагай да гісторыі Беларусі, прадметаў культурна-краязнаўчага цыкла. Выпускнікі аддзялення змогуць забяспечыць навучальны працэс у беларускамоўных школах рэспублікі.

**З 1992 года на факультэце пачата падрыхтоўка спецыялістаў па трох новых спецыяльнасцях: міжнародныя адносіны, гісторыка-архівазнаўства, музейная справа і ахова помнікаў гісторыі і культуры. Спецыялісты па гэтых спецыяльнасцях рыхтуюцца на двух новых аддзяленнях: міжнародныя адносіны, архівазнаўства і музеязнаўства, якія з'яўляюцца беларускамоўнымі.**

**Аснову выкладчыцкага калектыву факультэта складаюць высокакваліфікаваныя спецыялісты. У 1934 годзе ў штаце факультэта было толькі 14 супрацоўнікаў. У сучасны момант работу на факультэце вядуць 73 штатных супрацоўнікі, якія працуюць на 9 кафедрах факультэта.**

**Факультэт дае фундаментальную гуманітарную адукацыю. Яго выпускнікі — гэта спецыялісты з шырокім кругаглядам, высокім агульнаадукацыйным узроўнем. Студэнты атрымліваюць глыбокія спецыяльныя веды, неабходныя для будучай прафесіі. У першую чаргу — па гісторыі Беларусі, усеагульнай гісторыі, археалогіі, этнаграфіі, краязнаўству. Акрамя гэтага выкладаюцца такія дысцыпліны як логіка, псіхалогія, педагогіка, інфарматыка, беларуская мова і літаратура, замежная мова.**

**Сваю вучобу студэнты спалучаюць з навуковай работай: з вялікай цікавасцю маладыя даследчыкі распрацоўваюць праблемы айчыннай гісторыі і гісторыі замежных краін, удзельнічаюць у напісанні гісторыі гарадоў, раёнаў, прадпрыемстваў і ўстаноў. Яны выступаюць на навуковых канферэнцыях, прадстаўляюць свае працы на універсітэцкія і рэспубліканскія агляды-конкурсы.**

**Студэнты гістарычнага факультэта маюць магчымасць спецыялізавацца па гісторыі Беларусі, гісторыі славянскіх краін, гісторыі старажытнага свету і сярэднявечча, новай і найноўшай гісторыі краін Заходняй Еўропы, Амерыкі, Азіі і Афрыкі, па археалогіі, гісторыі рэлігіі і культуры, этнаграфіі, міжнародных адносінах, архіва- і музеязнаўству, гістарычнай інфарматыцы.**

**П. ШУПЛЯК,**
**дэкан гістарычнага факультэта**

